УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЖЫНОВІЧ (ЖЫДОВІЧ) ІОСІФ ІОСІФАВІЧ

**ЦЫМБАЛІСТ, ДЫРЫЖОР, КАМПАЗІТАР, ПЕДАГОГ,**

**НАРОДНЫ АРТЫСТ СССР**

**01 (14) ТРАЎНЯ 1907 Г. – 13 СТУДЗЕНЯ 1974 Г.**

**ФОНД № 180**

**ВОПІС № 1**

**1931–2011, коп. за 1926–1956 гг.**

**МІНСК 2025**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 180**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ І.І. ЖЫНОВІЧА | 1-19 | 1-3 |
| 1.1. | ДЫСЕРТАЦЫЯ, НАВУКОВАЯ ПРАЦА І ІНШ. І.І. ЖЫНОВІЧА | 1-6 | 1 |
| 1.2. | АСАБІСТЫЯ І ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.І. ЖЫНОВІЧА | 7-9 | 1-2 |
| 1.3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА І СА ЗГАДКАЙ І.І. ЖЫНОВІЧА | 10-13 | 2 |
| 1.4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.І. ЖЫНОВІЧА | 14-19 | 2-3 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ З.М. НАСЦЁНКІ - МУЗЫКАЗНАЎЦЫ, ВУЧАНІЦЫ І.І. ЖЫНОВІЧА | 20-29 | 3-4 |
| 2.1. | БІЯГРАФІЧНЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА З.М. НАСЦЁНКУ, КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ ДА ЯЕ І ІНШ. | 20-25 | 3-4 |
| 2.2. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ З.М. НАСЦЁНКІ | 26-29 | 4 |

## Прадмова

**Жыновіч (Жыдовіч) Іосіф Іосіфавіч** нарадзіўся [1 (14) траўня 1907 г. у вёсцы Арэшкавічы Пухавіцкай воласці Ігуменскага павету] (цяпер – Пухавіцкі раён Мінскай вобласці). У 1922 г. пачаў прафесійную дзейнасць салістам-цымбалістам БДТ-1 (цяпер – Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы). У 1923 г. разам з тэатрам гастраляваў у Маскве. Далучыўся да беларускага хору пад кіраўніцтвам хормайстра У.В. Тэраўскага. Выпусціў сваю першую кружэлку. У 1926 г. вучыўся ў музычнай школе (у т.л. у М.Ф. Мацісона). Адначасна здымаўся ў першым беларускім фільме "Лясная быль". У 1928 г. разам з С.М. Навіцкім выступаў на сцэне Вялікага тэатра СССР у канцэрце, прысвечаным дэлегатам IV Усесаюзнага з'езда Саветаў. У 1927–1930/31[1] гг. вучыўся на юрыдычным факультэце БДУ. У 1928 г. паступіў у Мінскі музычны тэхнікум (цяпер – Мінскі дзяржаўны музычны каледж імя М.І. Глінкі), пазней – у Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі). У гэты час выступаў сольна і ў дуэце з цымбалістам Х.Ё. Шмелькіным. У 1930 г. годзе разам заснаваў Дзяржаўны ансамбль беларускіх народных інструментаў, які ў 1937 г. ператварыўся ў Дзяржаўны народны аркестр БССР. Падчас Вялікай Айчыннай разам з аркестрам быў эвакуіраваны і накіраваны ў Казахскую дзяржаўную філармонію (цяпер – Казахская дзяржаўная акадэмічная філармонія імя Жамбыла). У 1944 г. вярнуўся ў БССР. Ад 1946 г. быў мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам Дзяржаўнага народнага аркестра БССР. У 1947 г. І.І. Жыновіч стварае Школу ігры на беларускіх цымбалах: па яго ініцыятыве адкрываюцца класы цымбалаў у музычных школах і вучылішчах, ствараюцца гурткі цымбалістаў у калектывах мастацкай самадзейнасці. Адначасова ён выдае брашуру "Беларускі дзяржаўны народны аркестр", гісторыка-этнаграфічную працу "Беларускія цымбалы" і праграму ігры на цымбалах для музычных школ. Ад 1949 г. ён з'яўляецца загадчыкам кафедры народных інструментаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі). У 1952 г. І.І. Жыновіч працуе над напісаннем дысертацыі "Гісторыя развіцця народных цымбал у Беларусі".

У лютым 1955 г. І.І. Жыновічу прысвоена званне "Народны артыст БССР". Ён быў ўзнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны". Аркестр пад кіраўніцтвам І.І. Жыновіча з'яўляўся лаурэатам Усесаюзных фестываляў і конкурсаў у 1957, 1960, 1963, 1967 і 1977 гг.

Памёр Іосіф Іосіфавіч Жыновіч 13 студзеня 1974 г. Пахаваны на Усходніх могілках г. Мінска.

Дакументы Іосіфа Іосіфавіча Жыновіча паступілі ў БДАМЛМ у два этапы. Першае паступленне было ў 1972 г. ад яго самога, другое – у 2012 г. ад

---

[1] Існуе разыходжанне ў датах заканчэння І.І. Жыновічам БДУ: у манаграфіі З.М. Насценкі "Іосіф Жыновіч (старонкі жыцця)" (Мінск: "Беларусь", 1969, С. 25) падаецца 1930 г., у артыкуле "Жыновіч (Жыдовіч) Іосіф Іосіфавіч" ("Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва: у 5-і тамах". Т.2. / Пад. рэд. І.П. Шамякіна і інш. – Мн.: БелСЭ, 1985, С. 462) – 1931 г.

Зоі Мікітаўны Насцёнкі – яго вучаніцы, музыказнаўцы. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 29 спраў (160 дак.) за 1931–2011, коп. за 1926–1956 гг.

Вопіс складаецца з 2 раздзелаў.

Першы раздзел “Дакументы І.І. Жыновіча” ўключае 4 падраздзелы.

Першы падраздзел “Дысертацыя, навуковая праца і інш. І.І. Жыновіча” прадстаўлены навуковымі працамі, партытурай беларускай народнай песні “Перапёлачка” і нш., сфарміраванымі па тэматычна-храналагічным прынцыпе за 1952 – [да 1974] гг.

У другі падраздзел “Асабістыя і творчыя дакументы І.І. Жыновіча” ўвайшлі афішы выступаў і гастроляў Дзяржаўнага народнага аркестра БССР пад яго кіраўніцтвам, падзякі і ўзнагароды за працу і за ўдзел ў юбілейных канцэртах і конкурсах І.І. Жыновічу і інш. Справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе за 1931–1973 гг.

Трэці падраздзел “Дакументы пра і са згадкай І.І. Жыновіча” складаецца з манаграфіі З.М. Насцёнкі “Іосіф Жыновіч (старонкі жыцця)”, артыкулаў пра І.І. Жыновіча і інш. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1955–2006 гг.

Чацвёрты падраздзел змяшчае фота І.І.Жыновіча, эскізы народных касцюмаў І.І. Пешкура для аркестра І.І. Жыновіча і інш. Справы сістэматызаваны па відах дакументаў, унтуры відаў – па храналогіі за 1957–1996, коп. за 1926 – [да 1974] гг.

Другі раздзел “Дакументы З.М.Насцёнкі – мовазнаўцы, вучаніцы І.І. Жыновіча” складаецца з двух падраздзелаў.

Першы падраздзел уключае ў сябе артыкул З.М. Насцёнкі пра цымбалы і цымбалістаў, біяграфічныя звесткі пра яе і яе сям’ю і інш. Справы сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1960–[2005–2006] гг.

Другі падраздзел змяшчае фотаздымкі З.М. Насцёнкі і інш. Справы сістэматазаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за [да 1943]–1974 гг.

Прадмову склала
вядучы архівіст В.І.Мазалеўская
24.02.2025

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
№ 5
ад 18.03.2025

ФОНД № 180
ВОПІС № 1
1931-2011, коп. за 1926-1956

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ І.І. ЖЫНОВІЧА** | | | | |
| | **1.1. ДЫСЕРТАЦЫЯ, НАВУКОВАЯ ПРАЦА І ІНШ. І.І. ЖЫНОВІЧА** | | | | |
| 1 | І.І. Жыновіч. "История развития народных цимбал в Белоруссии". Дысертацыя.<br>Машынапіс у пераплёце з фотаздымкамі цымбалістаў і інш. | 1952 | 202 | 1 | |
| 2 | Малюнкі цымбалаў з найменнямі частак і размяшчэннем гукаў да дысертацыі І.І. Жыновіча "История развития народных цимбал в Белоруссии".<br>Рэпрадукцыі | [да 1952 г.] | 4 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 3 | І.І. Жыновіч. "Дзяржаўны беларускі народны аркестр і музыкальныя інструменты беларускага народу". Артыкул.<br>Чарнавы аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | [да 1958 г.] | 19 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 4 | І.І. Жыновіч. "Школа для цимбал". Навуковая праца.<br>Машынапіс з аўтарскімі праўкамі з партытурай, фотаздымкамі, малюнкамі і інш. | [да 1974 г.] | 147 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 5 | І.І. Жыновіч. Партытура беларускай народнай песні "Перепёлочка" ў апрацоўцы аўтара.<br>Нотны рукапіс | [да 1974 г.] | 4 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 6 | Творчая аўтабіяграфія І.І. Жыновіча.<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай | 1960 | 3 | 1 | |
| | **1.2. АСАБІСТЫЯ І ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.І. ЖЫНОВІЧА** | | | | |
| 7 | Афішы выступаў і гастроляў Дзяржаўнага народнага аркестра БССР пад кіраўніцтвам | 1931-1970 | 5 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | І.І. Жыновіча | | | | |
| 8 | Праграмы канцэртаў Дзяржаўнага народнага аркестра БССР пад кіраўніцтвам І.І. Жыновіча, візітоўка І.І. Жыновіча | 1960-1968 | 26 | 11 | |
| 9 | Ганаровая грамата Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры І.І. Жыновічу за шматгадовую плённую працу і ў сувязі з 40-годдзем Дзяржаўнага народнага аркестра БССР. Падзяка дырэкцыі, партбюро і мясцовага камітэта Беларускай дзяржаўнай філармоніі І.І. Жыновічу за ўдзел у юбілейных канцэртах і конкурсах, дасягненне творчых поспехаў і інш. | 1970-1973 | 7 | 4 | |
| | **1.3. ДАКУМЕНТЫ ПРА І СА ЗГАДКАЙ І.І. ЖЫНОВІЧА** | | | | |
| 10 | З.М. Насцёнка "Іосіф Жыновіч (старонкі жыцця)". Манаграфія і водгукі на яе.<br>Друкаванае выданне з праўкамі і паметамі аўтара, машынапіс, выразкі з газет.<br>На фарзацы аўтографы з пажаданнямі ад Г.І. Жыновіч, К.Д. Цесакова, Д.Б. Смольскага і інш. З.М. Насцёнцы, надпісаныя ў [1969-2007 гг.]. | 1969-1970 | 52 | 5 | |
| 11 | З.М. Насцёнка "Цымбаліст Іосіф Жыновіч (наш настаўнік, мэтр, яго словамі)".<br>Машынапіс з аўтарскай праўкай і ўклейкай | 2006 | 176 | 1 | |
| 12 | Газетныя артыкулы пра І.І. Жыновіча, Дзяржаўны народны аркестр БССР і інш.<br>"Нар.арт. БССР, праф. Жыновіч І.І.".<br>Чарнавы аўтограф і машынапіс з праўкамі | 1955-1969 | 47 | 44 | |
| | *** | | | | |
| 13 | Водгукі М.Л. Старакадомскага, Я.К. Цікоцкага, Г.І. Цітовіча на дысертацыю І.І. Жыновіча.<br>Машынапіс | 1952 | 7 | 3 | |
| | **1.4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ І.І. ЖЫНОВІЧА** | | | | |
| 14 | Фотаздымкі І.І. Жыновіча, індывідуальныя.<br>Арыгіналы і копіі | [да 1974 г.], коп. за 1939 | 7 | 6 | |
| 15 | Фотаздымкі І.І. Жыновіча ў групах з Н.К. Бараноўскай, В.Н. Барсавым, С.М. Навіцкім, З.М. Насцёнкай, В.А. Самсонавым, А.І. Хачатуранам, М.М. Чуркіным, Х.Ё. Шмелькіным.<br>Некаторыя - з наклеенымі анатацыямі | 1960 - [да 1974 г.], коп. за 1926, 1946-1956 | 28 | 22 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 16 | Фотаздымак І.І. Жыновіча ў калгасе Мсціслаўскага раёна | 1967 | 1 | 1 | |
| 17 | Фотаздымкі ансамбля пры аркестры І.І. Жыновіча, самога аркестра, В. Бурковай В.А. Бурковіча, Т.М. Ніжнікавай, А.П. Огніўцава, К.Б. Федаровіча, Х.Ё. Шмелькіна, В.М. Чарнабаева і інш. Некаторыя - з наклеенымі анатацыямі. Фотаздымак дома, дзе жыў І.І. Жыновіч | 1957, 1960, 1964 - [ад 1974 г.] | 18 | 17 | |
| 18 | І.І. Пешкур. Малюнкі эскізаў народных касцюмаў для аркестра І.І. Жыновіча. Папера, аловак, акварэль, гуаш | [1960 - пач.1980 гг.] | 3 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 19 | Дакументы аб ушанаванні памяці І.І. Жыновіча. Пастанаўленне Савета Міністраў аб прысваенні Дзяржаўнаму народнаму аркестру БССР імя І.І. Жыновіча і ўсталяванні мемарыяльнай дошкі на доме, дзе ён жыў. Выразка з газеты. Запрашэнне Беларускай дзяржаўнай філармоніі на канцэрт, прысвечаны памяці І.І. Жыновіча, і інш. | 1974-1996 | 4 | 4 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ З.М. НАСЦЁНКІ - МУЗЫКАЗНАЎЦЫ, ВУЧАНІЦЫ І.І. ЖЫНОВІЧА** | | | | |
| | **2.1. АРТЫКУЛ З.М. НАСЦЁНКІ, БІЯГРАФІЧНЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА З.М. НАСЦЁНКУ, КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ ДА ЯЕ І ІНШ.** | | | | |
| 20 | З.М. Насцёнка. Артыкул пра цымбалы і цымбалістаў. Чарнавы накід. Машынапіс | [2005-2006] | 12 | 1 | |
| 21 | Біяграфічныя звесткі пра З.М. Насцёнку і яе бацькоў за 1901-2011 гг. Старонкі з успамінамі і дзеннікавымі запісамі З.М. Насцёнкі. Фрагменты. Машынапіс, аўтограф | | 19 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 22 | Паштоўка і тэлеграма неўстаноўленых асоб да З.М.Насцёнкі | 1976, 1986 | 2 | 2 | |
| 23 | Падзяка ад Савецкага камітэта VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў З.М. Насцёнцы за актыўны ўдзел у мерапрыемстве | 1960 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 24 | Часовы пропуск З.М. Насцёнкі ў чытальную залю Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР.<br>Чытальніцкі білет Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Акадэміі Навук БССР на імя З.М. Насцёнкі | 1982,1988 | 3 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 25 | А. Бутэвіч "Мірскі замак". Праспект.<br>Друкаванае выданне з пазнакамі З.М.Насцёнкі ад 02.08.2004 | | 8 | 1 | |
| | **2.2. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ З.М. НАСЦЁНКІ** | | | | |
| 26 | Фотаздымкі З.М. Насцёнкі, індывідуальныя | 1947-1974 | 9 | 9 | |
| 27 | Фотаздымкі З.М. Насцёнкі ў групах з Г.Г. Барташэвічам, І.І. Барташэвіч, С.А. Бурт і інш. | 1952-1962 | 4 | 4 | |
| 28 | Фотаздымкі Уладзіміра (брата З.М. Насцёнкі) і [знаёмай] Рыты | [да 1943 г.], 1952 | 2 | 2 | |
| 29 | Фотарэпрадукцыя з выявай жанчыны за цымбаламі з надпісам: "З архіва З.М.Насцёнкі.17.III.2008" | | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 29 (дваццаць дзевяць)
спраў з № 1 па № 29 , 160 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонду зрабіла
вяд. архівіст __________ В.І. Мазалеўская
20.02.2025

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў __________ В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.